ПАГОНЯ

РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД: ГОРАДНЯ — ВІЛЬНЯ — БЕЛАСТОК ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

№ 4 (60) 28 студзеня — 3 лютага 1994 года Кошт 100 рублёў

Сойм БНФ «Адраджэньне»

15 студзеня 1994 г. у Менску ў сядзібе БНФ адбыўся Сойм БНФ «Адраджэньне». У час пашыранай соймавай канфэрэнцыі быў заслуханы даклад старшыні БНФ «Адраджэньне» Зянона Пазьняка «Аб палітычнай сытуацыі і перавыбарчай пэрспэктыве».

Палітычная і эканамічная сытуацыі ў Беларусі рэзка пагоршыліся ў выніку эканамічнай вайны і ўмяшаньня контрразьведкі з боку Расеі ў справы суседняй сувэрэннай дзяржавы.

Робіцца стаўка на стварэньне рублёвай зоны, на манаполію пастаўкі нафты й газы, на нявыгадныя для Беларусі ўмовы клірынгавых паставак, на розьніцу цэн, на вярбоўку агентаў у ворганах КДБ, МУС і Вярхоўнага Савету, на прарасейскае лобі ў Саўміне, на выхаваньне імпэрскай сьвядомасьці, на ўвядзеньне двухмоўя і ўтварэньне канфэдэрацыі. Вядзецца мэтанакіраваная праца з боку ўрада Кебіча й большасьці Вярхоўнага Савету па ўключэньню Беларусі ў склад Расеі. Робяцца спробы поўнасьцю ўзяць пад кантроль Вярхоўны Савет, міністэрства бясьпекі і унутраных спраў і зьняць іх кіраўнікоў. Ідзе мэтанакіраваны развал эканомікі, каб спыніць прамысловасьць Беларусі.

Адзінай дэмакратычнай сілай, якая можа спыніць развал і выратаваць незалежную Беларусь, якая ня можа памыляцца,— гэта Беларускі Народны Фронт і дэмакратычныя партыі й блёкі Беларусі. Мы павінны ўмацаваць свае структуры на ўсіх узроўнях, вызначыць сваіх кандыдатаў на будучыя выбары, вывучыць палітычную і эканамічную сытуацыю на Беларусі і па месцы жыхарства, падтрымліваць цесныя кантакты з прадстаўнікамі бізнэса й прадстаўнікамі ўлады.

У гэтай крытычнай сытуацыі мы павінны выкрываць «прыхватызатараў» і карупцыянэраў і гаварыць, што злачынцы згодна рашэньням суда павінны сядзець у турме. Мы павінны прымушаць усімі сіламі ўлады навесьці парадак, патрабаваць ад улад, каб былі дадзены заданьні КДБ і МУС на пакараньне злачынцаў згодна законам.

Мы павінны настойваць на ўвядзеньні закона аб люстрацыях, згодна якому кампартыя павінна быць забаронена, бо яна змагаецца супраць незалежнай Беларусі, а яе вышэйшыя кіраўнікі не павінны дапускацца да ўлады на працягу 5—10-гадовага тэрміну.

Выбары на Беларусі, рана ці позна, адбудуцца. Але яны будуць не дэмакратычнымі, паколькі няма новага дэмакратычнага закону аб іх. Таму асноўная наша задача—пераконваць выбаршчыкаў, што праграма БНФ і дэмакратычных партый — гэта ня толькі праграма рэформ, але й адзінае выйсьце для пабудовы свабоднай, заможнай і квітнеючай дзяржавы Беларусь.

На Сойме была акрэсьлена палітыка й тактыка дзеяньня БНФ па падрыхтоўцы будучых выбараў.

Дэпутаты апазыцыі расказалі аб сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам, аб размове пры зачыненых дзьвярах і ў Курапатах.

Старшыня гарадзенскай Рады БНФ К. ЖЫНЬ.



Больш за дваццаць гадоў працуе ў вёсцы Гудзевічы, што на Мастоўшчыне, гісторыка-этнаграфічны музэй. Наведвальнікам музэю дэманструецца разнастайная палітра вясковага жыцьця беларусаў Прынёманья. Тут і ручная вышыўка, і падвойнае ткацтва, і драўляная атрыбутыка вясковага быту.

НА ЗДЫМКУ: А. М. Белакоз — заснавальнік музэя — распавядае чарговай групе наведвальнікаў аб славутых земляках свайго краю.

Фатаграфаваў Б. МЕШЧАРАКОЎ.

Адбыўся ўстаноўчы сход гарадзенскай раённай арганізацыі БНФ «Адраджэньне»

Днямі адбыўся ўстаноўчы сход Гарадзенскай раённай арганізацыі БНФ «Адраджэньне».

Удзел у сходзе прынялі прадстаўнікі трох суполак з вёсак Капцёўка, Граньдзічы й Рацічы, прысутнічалі сябры БНФ з іншых мясьцін Гарадзенскага раёна. На сходзе з уступным словам выступіў старшыня Гарадзенскай вабласной рады БНФ Мікола Баўсюк, старшыня раённай Рады ТБМ спадар І. Ф. Буднік, старшыня Капцёўскай суполкі БНФ сп. Віктар Ражко, таксама выступіў сп. Уладзімір Кісялевіч. Па выніках сходу вызначана раённая Рада, старшынёй у якой абраны Уладзімір Кісялевіч, намесьнікам—Віктар Ражко, скарбнікам — Уладзімір Дзьмітрук. Былі распрацаваныя неабходныя дакумэнты дзеля рэгістрацыі, якія хутка будуць накіраваныя ў райсавет Гарадзенскага раёна.

Жадаючыя далучыцца ці атрымаць пэўную інфармацыю аб дзейнасьці Гарадзенскай раённай рады могуць зьвяртацца да намесьніка старшыні рады спадара Віктара Ражко па тэлефоне 915-320.

(Спадар).

Дзядзя Сьцёпа пакідае звалку

Яшчэ нядаўна на гарадзенскай гарадзкой звалцы было чым пажывіцца, таму тут было заўжды людна. Ахвочыя пакапацца ў адыходах рабілі гэта не задарма, а з мэтай знайсьці сабе сёе-тое на будучыню й дзень надзённы. Часам сьмецьцязнаўцы за знойдзеную «каштоўнасьць» распачыналі бойку. Як сьлед, заўжды перамагаў больш моцны.

Дзядзя Сьцёпа быў адным з тых, хто, дзякуючы моцным кулакам, меў першынство ў раскопках сьмецьця. Ен дзяліў знаходкі паміж сваімі, вызначаў асабіста, што каму належыць. Апошнім часам дзядзю Сьцёпу няраздка можна ўбачыць на вуліцах горада з вялікім мехам. Пры адной з такіх нечаканых сустрэч кар. «Пагоні» згадаў толькі адно пытаньне «цару звалкі: «Чым выклікана зьмена дыслакацыі?»

— На жаль, капашыцца ў сьмецьці стала невыгодна. Зьбяднелы народ і зьбяднелыя прадпрыемствы зараз мала што выкідваюць. Раней за дзень на звалцы можна было знайсьці дабра на тысячы, а зараз можна ўпустую прапрацаваць дзень. Таму й прыходзіцца штодзень пашыраць гэаграфію працы — абыходзіць шматлікія дваровыя завалы.

«Хто што ахоўвае, той тое й мае...»

Здаецца, Міхаіл Жванецкі меў рацыю, калі сьцьвярджаў гэта. Як пацьверджаньне, ў Берасьцейскай вабласной пракуратуры ў выкананьні знаходзіцца крымінальная справа на інспэктараў мытні «Зарэчыца», пункта, праз які таварныя цягнікі ідуць з СНД на захад і назад. На «гарачым» тут папаліся трое мытнікаў, якія скралі з вагона 23 імпартныя плашчы.

На гэтым жа кантрольным пункце памежнікамі было скрадзена 16 магнітафонаў «Соні», некалькі карабаў абутку «Саламандра», 3 упакоўкі цыгарэт, 6 тэлевізараў «Філіпс», 12 лісіных шубаў (па 2 тысячы даляраў ЗША кожная), відэакамэры, відэамагнітафоны, моцныя напоі, адзеньне, цукар і іншыя тавары імпартнай вытворчасьці.

Па інфармацыі, якая ёсьць, па гэтых справах праходзяць каля шасьці дзесяткаў чалавек, з якіх у сьнежні толькі сямёра знаходзіліся ў сьледчым ізалятары.

Г. ПЯТРОЎ.

Да прадмесьця Вашынгтону на заробкі

Яшчэ адзін гарадзенец неўзабаве пакіне Горадню з мэтай зарабіць і паспрабаваць свае сілы на амэрыканскім кантыненьце.

На гэты раз ў далёкае падарожжа наважыўся прадстаўнік нацыянальнай меншасьці горада Юсуф Мірза Крыніцкі.

Будучы эмігрант распавёў кар. «Пагоні» ў прыватнай гутарцы так: «У мяне бліз Вашынгтону жыве цёця. Сёлета я быў у гасьцях і, дзякуючы яе пратэкцыі, займаўся выкладаньнем рускай мовы й літаратуры ў рускіх сем'ях, дзе незабыліся на існаваньне гістарычнай Радзімы.

За адзін ўрок мне плацілі 50 даляраў, у дадатак ленч і транспартныя расходы. Такія ўмовы працы мяне задавальняюць і я вырашыў паспрабаваць шчасьця на чужыне».

Помнік другой сусьветнай — прытулак для бомжа

Як стала вядома рэдакцыі «Пагоні» ад кампэтэнтных крыніц інфармацыі, праваахоўныя ворганы Горадні нядаўна разсакрэцілі прытулак мясцовых бяздомных у помніку Другой Сусьветнай вайны — танку, што знаходзіцца на Савецкім пляцы ў Горадні.

Кажуць, што небарак выдала частае груканьне аднаго з люкаў танку, якім яны карысталіся як уваходам.

Г. У.



ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

Маскоўскі сцэнар нам не падыходзіць

Жыцьцё добрасумленных людзей становіцца горшым амаль з кожным днём. Час ад часу на вуліцах, у працоўных калектывах успамінаюць выказваньні аднаго з кінагэрояў, дзе самым дрэнным пажаданьнем было жыць на адну зарплату. Сапраўды, як выжыць, калі раней, атрымаўшы зарплату, можна было купіць 130 кг мяса, а цяпер, каб купіць столькі мяса, неабходна мець заробак у 1,5 мільёна «зайцоў»? Як абараніць малазабясьпечаных, калі пры такіх дзяржаўных падыходах іх становіцца ўсё больш?

Таму я не магу маўчаць, спакойна глядзець, як адныя становяцца ўсё бядней, а другія багацеюць (на маю думку) за лік добрасумленнага люду, памяркоўнага беларускага народу?

Маё прадпрыемства — Гарадзенскае вытворчае аб ´яднаньне «Хімвалакно» — ліхаманкава кідаецца ў розныя бакі з адным пытаньнем — як выжыць, дзе атрымаць сыравіну, прадаць сваю прадукцыю? Якое знайсьці выйсьце з непрадуманых пастаноў Саўміна, законаў Вярхоўнага Савета, не парушаючы юрыдычных норм, якія часьцяком не адпавядаюць патрабаваньням рэальнага жыцьця? І самае дзіўнае ў тым, што пры такім крызісе камуністычная большасьць ВС не прыдумала нічога лепшага, як на тры дні заняцца абаронай сваіх паплечнікаў — былога першага сакратара ЦК Кампартыі Летувы М. Буракявічуса й загадчыка па ідэялогіі Ю. Ярмалавічуса.

А іх інакш як злачынцамі перад летувіскім народам назваць нельга. Гэта яны давалі загады гусеніцамі танкаў давіць мірнае насельніцтва, дзяцей. Нельга не пагадзіцца з тым, што пісала 19 студзеня «Комсомольская правда»: «Литва ликует: в вильнюсской Лукишской тюрьме оказались наконец-то основные организаторы вильнюсского путча 1991 года — первый секретарь ЦК КПЛ М. Буракявичус и его сподвижник Ю. Ермолавичус. Им предъявлено обвинение — по статьям 62 и 105 литовского Уголовного кодекса — в том, что они руководили заговорщиками, хотели свергнуть законную власть, а также соучаствовали в умышленном убийстве людей».

Калі каму й хочацца паказаць арышт вышэйназваных асобаў як «продаж палітэмігрантаў», то скажыце, чаму цяперашні прэзідэнт Летувы А. Бразаўскас не пайшоў у той час крывавым шляхам, а паказаў сваю рацыю на нядаўніх выбарах. І ўсё гэта пры тым, што ён узначаліў Летувіскую кампартыю у час застою.

Усю гэтую валтузьню вакол гэтых неістотных для беларускага грамадзтва падзей распачаў старшыня часовай камісіі Вярхоўнага Савета па барацьбе з карупцыяй дэпутат А. Лукашэнка. Так, так, менавіта той Лукашэнка, аб якім у чалавека недасьведчанага складаецца ўражаньне, што Аляксандр Рыгоравіч адстойвае інтарэсы сумленнага простага люду.

Але ж як гэтае ўражаньне спалучыць з тым, што інтарэсы Лукашэнкі супадаюць з інтарэсамі былога сакратара ЦК КПБ В. Ціхіні?

Дык з кім Вы на самой справе, Аляксандр Рыгоравіч, і каго Вы абараняеце? Інтарэсы народа й дзяржавы ці партыйнай намэнклатуры, якая ў сваіх лёзунгах і пастановах дэкляравала адно, а на самой справе рабіла другое — рабавала (і рабуе!) народ. Памятаеце: «Мы говорим партия, а подразумеваем — Ленин» — гаворым адно, а робім другое.

Аб тым, што Вы, народны дэпутат РБ Аляксандр Лукашэнка, выконваеце сацыяльны заказ, я ўпэўніўся 12 кастрычніка мінулага года. Тады, завітаўшы ў Горадню, Вы заявілі: «Датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савета рабіць нельга».

Ці варта зьдзіўляцца, успамінаючы й пра супадзеньне Вашых думак і падыходаў з поглядамі Хазбулатава й Руцкога, да якіх Вы разам з іншымі, таксама беларусамі, яшчэ да кастрычніцкіх маскоўскіх крывавых падзей езьдзілі за кансультацыяй?

На маю думку, памяркоўны беларускі народ ня хоча паўтору маскоўскага сцэнару на Беларусі. Нават тады, калі яго аўтарам будзе такі «барацьбіт», як Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

З павагай І. ПАЛУБОК, апаратчык Гарадзенскага ВА «Хімвалакно», дэпутат гарадзкога Савета.

«В некотором царстве, в некотором государстве»

Толькі й чуем са сродкаў інфармацыі, што савет «народных абраньнікаў» таго ці іншага ўзроўню не пагадзіўся пазбавіць свайго калегу за брудныя справы дэпутацкай недатыкальнасьці.

Адчуўшы сваю беспакаранасьць, нашы дэпутаты разхрабрыліся так, што страцілі ўсялякае сумленьне. Адзін на службовым легкавіку тараніць прахожых, другі — шляхам кулачнага бою тлумачыць калгасьнікам што па чым. Трэці — больш ніжэйшы рангам — старшыня гарадзкога савету нявялічкага палескага гарадка — грабе пад сябе ўсё, што можна. Калі ж органы правасуддзя схопяць за руку такога «народнага слугу», то як раз і распачынаецца ў Саветах вэрхал аб імунітэце. Бароняць абраныя ўсенародна дэпутаты сваіх калегаў з высокіх трыбун як толькі могуць. Падлічваюць магчымыя страты, што панясе наша дзяржава ў выніку, калі правасуддзе пераможа.

Магчыма, я змаўчаў бы, калі б такое адбывалася «в некотором царстве, в некотором государстве». Але ж гэта найбольш часьцей сустракаецца ў нас. Выходзіць, калі ты атрымаў мандат народнага даверу, то табе дазволена забіваць, гвалціць, красьці, казаць хлуху й за гэта — аніякай адказнасьці. Цікава, хто й калі надзяліў гэтых людзей такімі правамі? І ці спыталіся законатворцы прывілеяў аб тым у народа?

Р. ПІЛЬНЫ.

Ясь, які ўсё разумее

Ясь — першакласьнік, але ён любіць прытуліцца да вушака дзьвярэй і паслухаць ход сэсіі ВС Рэспублікі Беларусь. Паназіраўшы за Ясем раз-другі, я ня вытрываў і запытаў, што ён цікавага знайшоў у гэтым, калі мне, даросламу, цяжка разабрацца ў словах нашых «абраньнікаў». Ясь усьміхнуўся й згадаў, што гэта цікавей мульцікаў, таму што «парлямэнт дадэпутаціўся і яму таксама трэба сьпяваць калыханку».

В. ГАЙДА, сябра грамадзка-палітычнага аб ´яднаньня імя К. КАЛІНОЎСКАГА.

Нашыя вытокі

Усе мы выйшлі з «Паходні». Думаю, што большасьць сяброў розных дэмакратычных рухаў і партый, існуючых сёньня на Гарадзеншчыне, маглі б падпісацца пад гэтымі словамі. Менавіта «паходня» стала першай крыніцай, якая напітала далейшую адраджэнскую плынь. Першыя крокі «Паходні» былі вельмі складанымі. Людзі, адданыя Беларусі, толькі пачыналі шукаць адзін аднаго, каб аб ´яднацца дзеля агульнай справы. У сіле была КПСС, пільна сачыў за грамадзянамі КДБ. Але прафэсару Ткачову разам з аднадумцамі ўдалося сабраць моцнае ядро сумленных і адданых Бацькаўшчыне людзей у гісторыка-культурны клюб «Паходня». Тут вучыліся адстойваць сваю думку, размаўляць з аўдыторыяй, канчаткова акрэсьліваць свае пазыцыі. Памятаеце, ветэраны клюба, колькі людзей умяшчала невялікая зала гарадзкога Дома культуры на пасяджэньнях «Паходні». Колькі цікавых асоб выступала тут...

На жаль, час адбіўся й на жыцьці клюба. За апошнія гады ў Горадні ўтварылася шмат партый і рухаў, куды перайшлі многія пахаднянцы. Хтосьці па розных прычынах увогуле адышоў ад нацыянальнага руху, і «Паходня» ў колькасных адносінах значна паменшылася. Трэба аддаць належнае тым, хто падтрымліваў клюб пры жыцьці апошні час. На іх рахунку цікавыя справы, сустрэчы, акцыі й г. д.

Сёньня на грамадзкую арэну ўступіла новая плынь хлопцаў і дзяўчат, якія толькі-толькі пачынаюць асэнсоўваць: хто яны? Якая іх Бацькаўшчына? Дэмакратычныя зрухі канца 80-ых для іх — далёкая гісторыя. Хто дапаможа зрабіць першыя крокі? 1994 год абяцае быць гарачым для Беларусі і ў палітычных адносінах. За кім пойдуць людзі? А ці мала пытаньняў па гісторыі й культуры Беларусі?

Час насьпеў сабрацца зноў усім разам. І тым, хто аддаў нямала сіл справе Адраджэньня, і тым, хто жадае больш даведацца аб Бацькаўшчыне, нешта зрабіць для яе, набыць сабе новых знаёмых і аднадумцаў. І вельмі хацелася б, каб менавіта «Паходня» зноў стала для ўсіх гэтых людзей другім домам, як і некалі.

Сябры гісторыка-культурнага клюба «Паходня» чакаюць неабыякавых да жыцьця Беларусі кожны першы й трэці чацьвер на свае пасяджэньні ў памяшканьні Гарадзенскага гарадзкога Дома культуры а 19-ай гадзіне.

Старшыня клюба «Паходня» Варанец Віктар.

Рублёвая зона — не панацэя ад нядзеяздольнасьці ўраду

Памятаеце сумна вядомыя пастановы Вярхоўнага Савету Беларусі аб падаткавай палітыцы нашай дзяржавы як да прыватных вытворчых структураў, так і да дзяржаўных? Гэтая пастанова, нібыта магутная помпа, высмоктвала амаль увесь прыбытак з касаў прадпрыемстваў. Каб апраўдаць свае памылкі, «народныя абраньнікі» спасылаліся на страчаныя сувязі з рэспублікамі й рэгіёнамі былога СССР. Як панацэю для дзяржаўнай эканомікі ўладныя прыдумалі рублёвую зону.

Пра «выгоды» для эканомікі рэспублікі карэспандэнту «Пагоні» распавядае камэрцыйны дырэктар зьнешнегандлёвай фірмы «Інтэрсэрвіс» Сяргей Шагановіч»:

— Каб разабрацца ў сучасных захадах нашага ўраду на чале з прэм ´ерам, неабходна сягнуць да вытокаў стварэньня СНД. Менавіта тыя людзі, што сабраліся ў Віскулях, і павінны былі закласьці падмурак будучай фінансава-эканамічнай зоны, але з абавязковай новай разьліковай адзінкай. На жаль, кіраўнікі трох славянскіх рэспублік не змаглі правільна спрагназаваць будучыню свайго дзіцяці — СНД, і мала-памалу, на першы погляд, неблагая ідэя страціла сваю надзённасьць. Зараз, калі аналізую тыя пастановы й заявы, то разумею, што гэта была звычайная гульня адпаведных палітычных колаў Расеі з надзеяй захаваньня сваіх гэапалітычных мэтаў на тэрыторыі суседніх краін. Эканомікай тут і не пахла.

— З вашых слоў вынікае, што недапрацоўкі ў Віскулях зараз выпраўляе беларускі ўрад?

— Каб жа так. Наш Саўмін апынуўся самым нядзеяздольным ва ўмовах самастойнага разьвіцьця эканомікі. Наўзамен усенароднай прыватызацыі распачалася намэнклатурная прыхватызацыя. Непамерна разросшамуся апарату ўраду для захаваньня прэстыжных пасад ля дзяржаўнай кіраўніцы й спатрэбіліся дадатковыя падаткі. Калі ж, дзякуючы такой недальнабачнай палітыцы, на калені сталі ня толькі прыватнікі, але й дзяржпрадпрыемствы, урад адчуў, што за гэта прыйдзецца несьці адказнасьць. Таму ў яго сьценах і пачалося маланкавае шуканьне якога-кольвечы выйсьця.

— Няўжо рублёвая зона — гэта панацэя?

— Калі чую такія разважаньні, мне становіцца сьмешна, бо гэта нагадвае мне вядомыя пэрсанажы з байкі Крылова, дзе нехта апынуўся ў куце. Відавочна, што ў вялікім пралёце апынуўся Саўмін і Вярхоўны Савет Беларусі, а разам з ім і мы — народ.

— Гэта агульна, а што замінае вам быць у эйфарыі, напярэдадні падпісаньня дамовы?

— Дамова наўрад ці будзе падпісана з карысьцю для нашай дзяржавы. Скажыце, хто, які, кольвечы, гаспадар пагадзіцца за свой ня вельмі багаты абедзенны стол пасадзіць яшчэ некалькі нахлебнікаў?

— Скажам, што гэта расейска-беларускі стол!

— На першы погляд, так. Але ў сваіх заявах абодва бакі выказваюць думкі, што сюды ў хуткім часе далучацца і іншыя. Бачыце, наш урад замест таго, каб вырашаць свае эканамічныя пытаньні, траціць высілкі на нейкую сурагатную аднову былога СССР. Ці прымуць такое іншыя дзяржавы?

— Можа, наш ўрад выконвае чыйсьці загад!

— Гэты загад завецца настальгіяй партнамэнклатуры па былой вяльможнасьці.

Шкада, што ў нашага ўсходняга суседа палітычныя амбіцыі заўжды перамагаюць над ідэяй дабрабыту. Таму й нам чакаць лепшага ад будучай рублёвай зоны няма сэнсу. Расея найперш у сваім памеры аддае перавагу гэапалітыцы. А каб добра ўмацаваць свае пазыцыі, яна й выкручвае з Беларусі апошнія сілы. Разьлічваць жа на танныя энэрганосьбіты сьмешна, бо Расея разбазарыла свае багацьці й хутка з экспарцёра энэрганосьбітаў стане імпарцёрам.

— Тады дзе ж выйсьце!

— Адно, што трэба зрабіць гэтаму ўраду, пакуль яго ўласны народ ня выкінуў з гісторыі — гэта стварыць сваю фінансава-крэдытную сістэму. Распрацаваць ёй прэярытэтныя накірункі разьвіцьця. Толькі ўласная валюта зможа зьберагчы нас ад поўнага заняпаду. Зразумейце, што нам, бізнэсмэнам, лацьвей рабіць бізнэс, маючы такі дзяржаўны падмурак, як свае грошы. Тут неабмежаваны прастор для дзейнасьці. Варыянт жа з рублёвай зонай 1 да 3-ох ці 1да 1-го — гэта для ўсёй Беларусі бездань.

— Дзякуй Вам, Сяргей, за шчырую гутарку.

Размову вёў Г. АСТРОЎСКІ.



ГРАМАДЗТВА

Мінімальная зарплата — сродак пахмельля

Вячаслаў Кебіч у час свайго сьнежаньскага паходу па крамах хваліўся перад менчукамі, што павысілі мінімальную зарплату. «А многие депутаты были против ,— дадаў ён,— но мы настояли». На думку прэм 'ера, людзі павінны быць удзячны ўраду, што стануць зарабляць у паўтара раза болей.

Аднак не пасьпелі атрымаць нават аванс з новай зарплаты, як зноў пайшлі ў гору кошты. Спачатку на малочныя прадукты й лекі, потым — на мяса, сала, каўбасы й на многае іншае. І новы віток інфляцыі зьвёў 'усю ўрадавую дабаўку.

Хто памятае, якая мінімальная зарплата была год назад? Думаю, што далёка ня ўсе змогуць назваць лічбу. Яна тады складала ўсяго тры тысячы рублёў. А потым ластупова павялічвалася: 4,5 тысячы — ў красавіку, 6,600— ў чэрвені, 9 тысячаў — у жніўні, 15 тысячаў — у кастрычніку і 20 тысячаў — у лістападзе.

А як жа павышаліся цэны? У студзені мінулага года, калі памер мінімальнай зарплаты павысіўся на 50 працэнтаў, то рост розьнічных цэн і тарыфаў склаў 125 працэнтаў. Да ліпеня мінімальная зарплата вырасла ў 2,2 раза, а цэны — ў 5,11. У жніўні — адпаведна 3 і 6,29 раза, у кастрычніку — 5 і 8,56 раза, у лістападзе — 6,6 і 12,63 раза. Як бачым, цэны намнога хутчэй паднімаюцца.

Старшыня Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч выступіў супраць сістэмы павышэньня мінімальнай зарплаты. Па яго словах, гэта дае толькі новы віток інфляцыі. Галоўны банкір лічыць, што яна ў студзені вырасьце на 80 працэнтаў. А гэта значыць, што грашовая дабаўка нам выйдзе бокам, і мы станем яшчэ больш беднымі. Парадокс? Але ж гэта так.

Дзе ж выйсьце? Станіслаў Багданкевіч лічыць, што неабходна не павышаць мінімальную зарплату, а выплочваць ўсім аднолькавую кампэнсацыю. Цяпер мінімальная зарплата вырасла на 10 тысяч рублёў. Лічба малая, але той, хто мае аклад 300 тысяч рублёў, атрымае дадаткова 150 тысяч. А гэта ўжо даволі вялікая лічба. І дадатковых грошай будзе выплачана шмат, што прывядзе да абясцэньваньня беларускага рубля. Багданкевіч заўважыў, што цэны паднімаюцца аднолькава і для бедных, і для багатых. Таму неабходна даплочваць ўсім аднолькава, скажам, па 10 тысяч, аднак яго ніхто ў Вярхоўным Савеце не падтрымаў.

Народны дэпутат Беларусі Аляксандр Сасноў назваў павышэньне мінімальнай зарплаты сіндромам пахмельля. Пьяны прачынаецца рана і ў яго баліць галава. Ен ведае, калі вып 'е, то зноў захочацца і зноў будзе балець галава. Але ж вельмі хочацца. І п 'е. А заўтра зноў усё пачынаецца з галаўной болі. Так і з ростам мінімальнай зарплаты. Сасноў прапанаваў не павялічваць яе, а ісьці шляхам індэксацыі, улічваючы рост цэн і даходы кожнага. Калі хтонебудзь зарабіў мільёны ў месяц, то ён нічога дадаткова не атрымае. А бедныя, асабліва пэнсіянэры, інваліды і іншыя сацыяльнанезабароненыя катэгорыі насельніцтва будуць мець значную даплату. Індэксаваньне таксама дапаможа ўтрымліваць інфляцыю, бо яна перашкодзіць выкідваць грошы тым, у каго яны ў дастатку.

Памятаецца, на сэсіі Вярхоўнага Савета да мікрафона выйшаў Вячаслаў Кебіч і сказаў: усё гэта добра, але трэба пралічваць. Дык хто ж Саўміну, які зноў разбух ад чыноўнікаў, перашкаджаў лічыць? Думаецца, што ва Урадзе нават не спрабавалі гэта рабіць, бо проста падняць мінімальную зарплату намнога лягчэй.

Але, відаць, цяперашняе павышэньне мінімальнай зарплаты будзе апошнім. Як бы не хацелася чыноўнікам ня думаць, але прыйдзецца, бо трэба ратавацца ад росту цэн і інфляцыі.

У. СЕМЯНЦОЎ.

Першы блін камяком

Адной з умоў для атрыманьня Рэспублікай Беларусь крэдытаў ад Міжнароднага валютнага фонду зьяўляецца правядзеньне прыватызацыі. Нарэшце й Горадня пачала ўносіць у гэта свой уклад.

29 студзеня ў будынку гарвыканкама ўпершыню праводзіўся продаж аб 'ектаў камунальнай уласнасьці на конкурснай аснове, на які былі выстаўлены цырульні й фотамайстэрні. Яго працэдура выглядала наступным чынам. Загадчык аддзела па прыватызацыі й раздзяржаўленьню дзяржаўнай маёмасьці У. П. Чэбатаровіч перад прысутнымі разрываў канвэрты й зачытваў бізнэс-планы пакупнікоў. Потым конкурсная камісія ў складзе 6 чалавек вызначала пераможцаў па крытэрыях выкананьня ўмоў конкурсу (захаваньне профілю прадпрыемства й рабочых месц на пэрыяд арэнды), найбольш поўнае задавальненьне патрэбаў насельніцтва й больш высокая сума грошай, прапануемая за аб 'ект.

На набыцьцё цырульні № 25 па вуліцы Болдзіна было пададзена дзьве заяўкі. За 5,050 мільёна рублёў яе набыла Іпрэва Тамара Міхайлаўна, якая зьбіраецца з дапамогай дызайнэра аформіць памяшканьне ў сучасным стылі, стварыць масажны габінэт і фіта-бар, праводзіць кансультацыю з кліентам па дагляданьню за пазногцямі й валасамі, выкарыстоўваць экалагічна-чыстыя прэпараты.

На цырульню № 26, што на бульвары 60 год Кастрычніку, «паклалі вока» тры чалавекі. Але перамагла Руднева Алена Віктараўна. У яе планах — стварэньне новых рабочых месцаў (мінімум 4), бясплатнае аказаньне паслуг інвалідам 1-ай і 2-ой груп, якія выклікалі майстраў на дом, рамонт памяшканьня, зьмена мэблі і абсталяваньня, арганізацыя гандля спадарожнымі таварамі, супрацоўніцтва з вучэльняй бытавікоў. Яна гатова была заплаціць на 500 тысяч болей, чым канкурсант, які прапануе большую суму. У выніку цырульня была набыта за 7 мільёнаў рублёў.

Уладальнікам цырульні № 28 па вуліцы Брыкеля стала Аляксеева Алена Аляксандраўна, якая заплаціла за яе 2,350 мільёна рублёў і зьбіраецца стварыць манікюрную залу, аказваць максімум бытавых паслуг кліентам і абслугоўваць малазабясьпечаных на ільготных тарыфах.

За 6,050 мільёна рублёў набыла цырульню № 16, што па вуліцы Соламавай, Пазюк Валяньціна Сьцяпанаўна. Яна мяркуе стварыць у памяшканьні пэдыкюрны габінэт, швэйную майстэрню, краму па продажы спадарожных тавараў, пракат відэакасет, а таксама рабіць 30-ціпрацэнтную скідку для малазабясьпечаных.

Потым за 4,55 мільёна рублёў была прададзена фотамайстэрня № 10 па вуліцы Урублеўскага. Яе ўладальнік — Коршунаў Ігар Валяньціначіч — плануе стварыць новыя рабочыя месцы, скарацідь час аказаньня паслуг і павысіць іх якасьць, зьменшыць выкарыстаньне ўсіх відаў энэргіі, дзякуючы ўстаноўцы сучаснай імпартовай тэхнікі й зьнізіць цэны за паслугі для малаемаёмасных.

За 2 мільёны 150 тысяч рублёў стаў уладальнікам фотамайстэрні № 11 па вул. Брыкеля Касэнка Юры Джонавіч. У яго планах — арганізацыя фотавідэадымкаў, студыі гуказапісу, пракату відэакасет.

А вось з продажам цырульні № 3 на вуліцы Гарнавых» узьнікл праблемы. На яе набыцьцё была пададзена толькі адна пісьмовая заяўка, у якой Клімовіч Валеры Леапольдавіч прапанаваў заплаціць за аб 'ект 11 мільёнаў. Ен плануе тут адчыніць гравёрную майстэрню, аказваць паслугі па рамонту гадзіньнікаў і парасонаў, арганізаваць гандаль спадарожнымі таварамі. Але вялікае жаданьне набыць цырульню выказаў яшчэ Мажэйка Аляксандр Антонавіч, якому конкурсная камісія дазволіла выказаць прапановы ў вуснай форме. Ен сказаў, што ім праведзены сход з членамі працоўнага калектыву, з якім знойдзена агульная мова, паведаміў, што жадае стварыць атэльє па пашыву разнастайных вырабаў з футра, павялічыць колькасьць рабочых месц і амаль на палову зьнізіць цэны на паслугі. Калі ў камісіі ўзьнікла пытаньне, чаму ён не пералічыў залогавую суму, ён сказаў, што быў у камандыроўцы, але гатовы зараз жа зрабіць гэта. Потым у зале засталіся толькі члены камісіі, бо паміж імі пачалася спрэчкі. Калі астатніх запрасілі заняць свае месцы, то паведамілі, што перамог А. Мажэйка. Але яго канкурэнт не быў задаволены гэтым і сказаў, што гэта незаконна й што ён абскардзіць рашэньне. У выніку было вырашана даручыць юрыдычнай службе разгледзець законнасьць рашэньня і калі яно адпавядае ўмовам конкурсу, то ўладальнікам цырульні становіцца А. Мажэйка пры выкананьні ім усяго сказанага. Калі ж не, перанесьці продаж аб 'екта на наступны конкурс ці аукцыён, аб выніках разгляду паведаміць праз два тыдні.

А. ДУК.

Шаноўная рэдакцыя!

Падзея, пра якую я хачу расказаць, на жаль, засталася па-за ўвагай нашае прэсы. І тым ня менш, хто б як ні ставіўся да гэтай падзеі, было б несправядліва замаўчаць яе, не пазнаёміць з ёй чытачоў, якія маюць права на атрыманьне разнастайнай інфармацыі.

Справа ўся ў тым, што сход, які адбыўся ў Пінску напачатку лістапада мінулага года, можа скалыхнуць увесь ветэранскі рух, які, на думку многіх ветэранаў, ужо даўно чакае кардынальных зьменаў.

Група пінскіх ветэранаў вайны й працы вырашыла зьніцыятаваць стварэньне ў сваім горадзе (а ў пэрспэктыве — і ня толькі) новай ветэранскай арганізацыі. Яны лічаць зусім натуральным наяўнасьць у грамадзтве розных поглядаў, аднак ня могуць больш мірыцца з тым, што існуючыя ветэранскія структуры ўвесь час імкнуцца гаварыць ад імя ўсіх ветэранаў і людзей сталага ўзросту, пры гэтым усё робіцца з артадаксальных камуністычных пазыцый. Многія ветэраны абураны тым, што кіраўніцтва існуючых ветэранскіх структур досыць часта выступае супраць дзяржаўнасьці Беларусі, яе сымболяў, супраць дэмакратычных пераўтварэньняў у грамадзтве і супраць рэфармаваньня нашае эканомікі.

І вось на пачатак лістапада быў прызначаны арганізацыйны сход новай ветэранскай арганізацыі — Аб 'яднаньне ветэранаў дэмакратычнай арыентацыі (АВДА). На сход, які адбыўся ў пінскай гарадзкой бібліятэцы, прыйшло больш за 70 чалавек. Аднак ён ледзь не быў сарваны. На гэты збор вырашылі прыйсьці таксама й прадстаўнікі афіцыйнай ветэранскай арганізацыі Пінска, а таксама члены ВЛКСМ... Увесь час гэтая група правакавала сабраўшыхся на бурныя дыскусіі, якія мелі на мэце звесьці сход з нармальнага шляху па абмеркаваньню праэкта Статута Пінскай гарадзкой арганізацыі АВДА. Урэшце-рэшт, зразумеўшы, што ветэраны, якія тут сабраліся, ня кінуць свайго намеру па стварэньню новай ветэранскай арганізацыі ў горадзе, памянёная пракамуністычная групоўка пад бурныя воплескі прысутных вымушана была пакінуць залю, пасылаючы праклёны й пагрозы іншадумцам. Пасьля гэтага праца ў залі пайшла спакойна й канструктыўна. Прысутныя ўхвалілі статутныя дакументы, выбралі праўленьне АВДА, у склад якога ўвайшло 9 чалавек. Старшынёй новай пінскай ветэранскай арганізацыі стаў былы рабочы «ЦЭЦ», ветэран працы сп. Н. Лагодзіч. У заяве кіраўнікоў АВДА было сказана: «Не жадаем, каб, не спытаўшы нас, гаварылі ад нашага імя... Мы хочам пазьбегнуць новага ўкараненьня ў наш быт і сьвядомасьць супрацьпраўнай для грамадзтва практыкі дыктата».

Асноўнымі накірункамі дзейнасьці АВДА, згодна статуту, вызначаны наступныя:

— абарона правоў ветэранаў горада (членаў АВДА);

— аказаньне матэрыяльнай і маральнай дапамогі сябрам аб 'яднаньня;

— адраджэньне духоўнасьці, здаровых народных пачаткаў жыцьця, такіх натуральных каштоўнасьцяў, як сям 'я, дом, добрасуседзтва, любоў да працы;

— праваздзеньне выхаваўчай работы з моладдзю горада.

Сябрам АВДА можа быць любы чалавек, незалежна ад прафэсіі, сацыяльнага становішча, нацыянальнай прыналежнасьці, веравызнаньня, які дасягнуў ветэранскага ўзросту. Аднак сяброўства ў АВДА г. Пінска несумяшчальнае з прапагандай таталітарызму, нацыянальнай і класавай варожасьці, з рэлігійнай і ідэйнай нецярпімасьцю, заклікам да гвалту.

Новая ветэранская арганізацыя існуе на сяброўскім складкі членаў аб 'яднаньня, а таксама на ахвяраваньні іншых грамадзян і арганізацый.

Пінскія ветэраны спадзяюцца, што іх ініцыятыва будзе падтрымана ў іншых месцах.

P. S.: *Для тых, хто хацеў бы азнаёміцца са Статутам АВДА г. Пінска, падаем адрас: 224000 г. Берасьце (Брэст), а/с 40, па якому дашліце канвэрт са зваротным адрасам.*

А. КРАШЭЎСКІ.

ЗВАРОТ

арганізацыйнага камітэта па стварэньню альтэрнатыўнай арганізацыі ветэранаў Беларусі да ветэранаў г. Горадні й вобласьці

Мы лічым, што існуючая аганізацыя ветэранаў Рэспублікі Беларусь, створаная яшчэ ў часы СССР камуністычнай партыяй дзеля ажыцьцяўленьня яе палітычных мэтаў, выступаючы ад імя ўсіх нас, паказала сябе ва ўсіх сваіх палітычных акцыях і, перш за ўсё, ў Вярхоўным Савеце як антыдзяржаўная, антыбеларуская арганізацыя, якая адстойвае ў сучасны момант інтарэсы былой савецкай, партыйнай і ваеннай наменклатуры.

Мы лічым, што такая арганізацыя не павінна ўдзельнічаць у вырашэньні лёсу беларускага народа ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь.

Мы лічым, што структуры такой арганізацыі не павінны ўтрымлівацца за кошт дзяржавы, г. зн. за кошт ўсяго народа.

Таму мы заклікаем ветэранаў вайны, працы, Узброеных Сілаў, ахвяраў палітычных рэпрэсій горада Горадні й вобласьці, якіх непакоіць свой лёс, лёс іх дарагіх нашчадкаў, лёс нашае Бацькаўшчыны, актыўна ўдзельнічаць у стварэньні альтэрнатыўнай сапраўднай ветэранскай арганізацыі.

Мы хочам, каб свае праблемы ветэраны вырашалі самі. Гэтыя праблемы ня здольны вырашыць былыя партыйныя функцыянэры, ім ня замінаюць чужыя беды як простых ветэранаў, так і ўсяго беларускага народа.

Калі Вы жадаеце прыняць удзел у стварэньні нашай арганізацыі ці ўвайсьці ў яе, просім зьвяртацца па тэлефоне 45-45-01 ад 10.00 да 17.00 кожны дзень, акрамя суботы й нядзелі.

г. Горадня, 19.01.94 г.

Ветэранскі арганізацыйны камітэт.



СУМЕЖЖА

Весткі з Летувы

Паміж Усходам і Захадам

Замест таго, каб стаць мастом паміж Усходам і Захадам, Летува пагражае стаць мейсцам, якое даводзіцца абмінаць. Цяпер на межах і мытнях цягнікі вымушаны прастойваць гадзінамі. Толькі ў сьнежні мінулага года спазьнілася больш за тысячу цягнікоў, што праяжджаюць праз тэрыторыю краіны. Праз Летуву ўжо больш ня ходзіць цягнік Масква-Беласток, з 1-га лютага гэтага года будуць абмінаць яе цягнікі Пецярбург-Бэрлін і Пецярбург-Варшава.

●

Прэзыдэнт Бразаўскас на сутрэчы з паслами, акрэдытаванымі ў Летуве, заявіў, што хацеў бы, каб у палітычным сэньсе Летуву разглядалі як краіну Цэнтральнай Эўропы. Падчас гэтае сустрэчы распавёў пра асноўныя дасягненьні й мэты зьнешняе палітыкі дзяржавы. Прыярытэтным напрамкам было названа наладжваньне ўзаемаадносінаў з бліжэйшымі суседзямі. Летува надзвычай зацікаўлена ў посьпеху працэсаў дэмакратыі й рынкавых рэформаў у Расеі, Беларусі, Украіне. Бяз гэтага, мяркуюць, немагчыма дасягнуць уласнае бясьпекі й дабрабыту.

●

Замест зьліквідаванай групы дзеля перагавораў з Расеяй у Летуве створана група дзеля перагавораў з краінамі Садружнасьці Незалежных Дзяржаў.

●

Як вядома, кіраўніцтва НАТА прапанавала альтэрнатыўны варыянт інтэграцыі — праграму «Партнёрства дзеля міру». Гэтая праграма прадугледжвае сумесныя вайсковыя манэўры, апэрацыі дзеля падтрыманьня міру, магчымасьць кансультавацца падчас узьнікненьня непасрэднае пагрозы тэрытарыяльнай цэльнасьці, палітычнай незалежнасьці ці бясьпецы. Кіраўніцтва Летувы пагадзілася з такой прапановай пры ўмове, што гэта будзе прыступкай дзеля поўнага ўваходжаньня ў вайсковыя й палітычныя структуры НАТА. 27 студзеня А. Бразаўскас сам наведае штаб-кватэру Паўночна-атлантычнага саюзу, каб падпісаць праграму «Партнёрства дзеля міру».

Тым часам у Летувіскай прэсе пачынаюць выказвацца сумненьні адносна мэтазгоднасьці хуткага далучэньня да НАТА — мяркуюць, гэта запатрабуе каласальных сродкаў і дзеля гэтага могуць быць патрачаныя ўсе замежныя крэдыты.

●

Летува, Латвія і Эстонія вырашылі стварыць сумесную вайсковую арганізацыю — Балтыцкі батальён міру. У яго складзе будзе 650 чалавек. Камандзіры й жаўнеры штогод будуць замяняцца на новых. У лютым месяцы гэтага году сумесныя вайсковыя манэўры пройдуць у Эстоніі, потым у ліпені — у Летуве, а ў кастрычніку — у Латвіі.

За і супраць

Сэйм Летувіскай Рэспублікі прыняў закон, які дазваляе асобам ад 25 гадоў набываць, захоўваць, мець пры сабе агнястрэльную зброю — пісталет (рэвальвер) калібру ня болей за 9 мм, гэта значыць, ня высокай забойнай моцы. Дазвол на зброю будуць выдаваць мясцовыя камісарыяты паліцыі. Паводле гэтага ж закону, асобы, якія незаконна набылі зброю, мусяць здаць яе да 1 красавіка бягучага года. Таму, хто самахоць зробіць гэта, ня будзе пагражаць крымінальная адказнасьць, наадварот — за здадзеныя арсэналы прадугледжана кампэнсацыя.

●

Сэйм Летувіскай Рэспублікі адмысловай папраўкай да закона аб прадпрыемствах забараніў ствараць і ўтрымліваць казіно і іншыя дамы дзеля азартных гульняў.

Госьці ў Летуве

Паводле дадзеных Дэпартамэнту Статыстыкі пры ўрадзе Летувіскай Рэспублікі ў дзяржаўных і прыватных гатэлях Летувы й матэлях, турыстычных асяродках і кэмпінгах закватаравана было ў трэцім квартале мінулага году 132 тысячы асоб, з іх 89 тысяч — чужаземцы.

Найбольшая колькасьць гасьцей была з СНД (43 тысячы). З Заходняй Эўропы было 19 тысяч, з Паўднёвай Эўропы — 8 тысяч, з Усходняй — 6 тысяч чалавек.

Новы закон

пачаў дзейнічаць у гэтым годзе. У выпадку сьмерці грамадзяніна рэспублікі член яго сям'і або асоба, якая яго даглядала, атрымае дапамогу, роўную тром пражытачным мінімумам.

У выпадку сьмерці інваліда, пэнсіянэра або члена сям'і, які атрымліваў сацыяльную дапамогу, сума гэта павялічыцца ў два разы.

Грашовая дапамога з бюджэту самаўпраўленьняў выплачваецца на працягу 24 гадзін ад моманту зьвяртаньня да іх.

Най... Най...

Найбольш папулярным палітыкам у мінулым годзе стаў прэзідэнт Альгірдас Бразаўскас. Другое месца заняў лідар Саюза Айчыны (Летувіскія кансэрватысты) Вітаўтас Ландзбэргіс, трэцяе — намесьнік старшыні Сойму Эгідзіюс Бічкаўскас.

Найбольш важным здарэньнем рэспандэнты лічаць візыты ў Летуву Яна Паўла II, вывад войск Расеі і ўвядзеньне сваёй валюты — літа.

Анкэтаваньне правёў асяродак дасьледваньня грамадзкай думкі «ВАЛМОРУС».

88 па ліку

Першая паштовая марка з сэрыі «Эўропа» выдадзена па ініцыятыве Эўрапэйскага Саюза Пошт і Тэлеграфаў, у якую з мінулага года ўваходзіць і Летува. Гэтая міжнародная арганізацыя кожны год прапануе краінам сьвету выданьне паштовых марак на акрэсьленую тэму. У мінулым годзе такой тэмай было сучаснае мастацтва.

На першай летувіскай марцы з гэтай сэрыі прадстаўлена карціна Антанаса Гудайціса «Стары майстар», выкананая ў 1939 годзе.

Тыраж маркі — паўмільёна паасобнікаў, намінальная вартасьць — 80 цэнтаў. Надрукавана яна ў маскоўскай друкарні «Дзяржзнаку».

На працягу трох гадоў незалежнасьці Летува выдала ўжо 87 паштовых марак, марка з сэрыі «Эўропа» зьяўляецца 88 па ліку.

Аб'ява

Пасольства Рэспублікі Беларусь у Летуве пераехала ў будынак па вул. П. Кліма, 8 (раён вул. Чурлёнё).

Праезд ад вакзала тралейбусамі № 15, 16 да прыпынку Кауно, далей тралейбусамі № 4, 6, 11 да прыпынку Канарскага.

Праезд ад аэрапорту: аўтобусам № 2 да прыпынку Чурлёнё.

Праезд з цэнтра горада тралейбусамі № 4, 6, 11, аўтобусамі № 22 да прыпынку Канарскага.

Прыём грамадзян вядзецца штодзённа, акрамя суботы, нядзелі й сьвят. Па пытаньнях грамадзянства і іншых: 10.00—13. 00. Па пытаньнях атрыманьня віз (для грамадзян краін, з якімі існуе візавы рэжым): 15.00—16. 00.

Тэлефоны: (0122) 65-08-71, (0122) 65-22-32 факс.

Паштовы адрас: Baltarufijos Respublikos Ambasada, P. Klimo 8, Vilnius 2009, Lietuvos Respublika.

Весткі з Польшчы

Сэймавая камісія па нацыянальных і этнічных меншасьцях 19 студзеня гэтага года разглядала праэкт бюджэту Міністэрства культуры й мастацтва на 1994 год у частцы, якая датычыць фінансаваньня дапамогі для культурных дзеяньняў меншасьцяў.

На пасяджэньні была створана падкамісія па справах закону аб нацыянальных і этнічных меншасьцях.

■

«Учора, сёньня й заўтра ў Польска-летувіскіх адносінах»,— гэта тэма нарады, якую ў Варшаве арганізаваў агульнапольскі клюб любіцеляў Летувы.

Некалькі дзесяткаў інтэлектуалаў, парлямэнтарыяў, гісторыкаў абмяркоўвалі сукупнасьць польска-летувіскіх адносін у супастаўленьні сытуацыі на Эўрапэйскім кантыненьце.

■

Банкноты вартасьцю: 100000, 500000 і 1 млн. нацыянальнага банка Польшчы маюцца ў бліжэйшы час быць заменены на новыя з дадатковымі вадзянымі знакамі. Зьнешне іх выгляд застанецца ранейшым.

Выклікана гэта неабходнасьць вялікай колькасьцю падробак менавіта банкнотаў гэтай вартасьці.

■

Шэсьць рабочых мясакамбіната, што ў Элку, аб'явілі галадоўку, патрабуючы адстаўкі намесьніка старшыні гэтага прадпрыемства, а таксама павысіць заработную плату на адзін мільён.

■

Госьцем агульнага сходу суддзяў Беластоцкай акругі, быў міністар Юстыцыі В. Цімашэвіч. Міністар прадставіў сабраўшымся праэкт бюджэту ведамства на 1994 год, які будзе большы, чым плянавалася. Гэта дазволіць пачаць кампутарызацыю судоў, ліквідаваць пратэрмінаваныя выплаты суддзям, пракурорам і павысіць зарплаты ў раённых юрыдычных установах.

■

У Нарве перанесена са старога на новы могільнік драўляная царква XVIII стагоддзя. Пры нагодзе будзе часткова зьменена канструкцыя сьцен і даху. Рамонт храма праводзіцца са згоды і пры фінансавай падтрымцы Ваяводзкага рэстаўратара помнікаў у Беластоку.

■

Лік беспрацоўных у Беластоцкім ваяводзтве на працягу мінулага года пастаянна падвышаўся і ў сьнежні дасягнуў 45 тысяч чалавек, што складае 14% ад агульнага ліку занятасьці насельніцтва. Амаль палова беспрацоўных страціла ўжо права на грашовую дапамогу.

■

Вакальны ансамбль «Каліна» з вёскі Дашы Ляшчэлеўскай гміны сьвяткаваў 16-годдзе свайго існаваньня. Калектыў, які заснаваўся па ініцыятыве В. Міцэвіч і С. Кердалевіч, выконвае мясцовыя беларускія народныя песьні. Юбілейную вечарыну сваёй прысутнасьцю ўдастоіў І. Хадасевіч, віцэ-консул генэральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку.

Па матэрыялах польскага друку.



Друзгеніцкія вайсковыя могілкі, дзе пахаваны воіны, загінуўшыя падчас вызваленьня горада ад нямецка-фашыстоўскіх захопнікаў.
Фатаграфавала А. БІБІКАВА.

Затрымка зарплаты

Упершыню за час інфляцыі на гарадзенскім вытворчым аб'яднаньні «Гродназнэрга» затрымалі больш як на два тыдні выплату зарплаты.

Першапрычына тут ня ў нейкіх недапрацоўках бухгалтэрыі, а ў непасьлядоўных разьліках прадпрыемстваў і ўстаноў Горадні з электрасеткамі.

Чатырохдзёнка — ня выйсьце

Адразу ж пасьля калядаў гарадзенскі завод «Радыёпрыбор» перайшоў на чатырохдзённы рэжым працы. Але ці выратуе завадчан такі крок? На думку інжынера па забесьпячэньню, чатырохдзёнка — ня выйсьце, бо заводу хранічна не хапае камплектуючых. Яны ёсьць у сумежнікаў, але тыя патрабуюць папярэднюю аплату.

На жаль, каса завода пустая. У той жа час сумежныя прадпрыемствы Расеі маюць запазыку перад гарадзенцамі ў некалькі соцень мільёнаў рублёў.

Падлік будзе строгі

Многія ўстановы й прадпрыемствы Горадні апошнім часам пачалі забясьпечваць сябе лічыльнікамі электраэнэргіі.

«Нас прымусіла пайсьці на такі крок неабходнасьць, бо гарадзенскія энэргэтыкі пры адсутнасьці лічыльнікаў выстаўляюць непамерныя рахункі на электраэнэргію»,— згадаў кар. «Пагоні» гаспадарнік гарадзенскага НДУ «Белгіпрабуд» спадар Міхайлаў.— Сёлета мы ўстанавілі лічыльнікі ў сваім піянэрлагеры й дзіцячым садку, на чарзе—будынак інстытуту».

Г. У.

ГІСТОРЫЯ Й СУЧАСНАСЬЦЬ

Трохразовы падатак

Пра разгромленыя партызанамі нямецкія гарнізоны й пра дапамогу з Вялікай зямлі ў час Другой Сусьветнай вайны напісана шмат. На думку аўтара гэтых радкоў, тыя, хто пісаў пра партызанскі рух на Беларусі, занадта сьціпла крануліся тэмы забесьпячэньня партызанаў харчам, вопраткай і многім іншым. Сёньня газэта «Пагоня» спрабуе зьліквідаваць гэты прагал, прапануючы чытачам успаміны ўладальніка палескага хутара Калаварот Пятра Дварановіча.

— У першую ж зіму вайны па нашай акрузе пайшлі чуткі, што пачалі па хатах хадзіць людзі, якія завуць сябе партызанамі. У час такіх візытаў няпрошаныя госьці патрабуюць цёплыя рэчы — кажухі, ватовыя порткі, суконныя рэчы, бялізну. Да таго ж забіраюць сала, муку, цыбулю, бульбу. Пры адмове ўладальніка аддаць нажытае дабро людзі гэтыя прымяняюць сілу. Весткі штодня прыходзілі самыя жудасныя. Сяляне цішком згадвалі, што той ці іншай ноччу былі абрабаваныя такіясьці вёскі. Каб захаваць сваё дабро, вяскоўцы пачалі хаваць нажытае. Часьцей за ўсё адвозілі ў патаемныя месцы ці закопвалі ў ямы. Тое самае зрабіў і я. Але доўга радавацца свайму спрыту не давялося.

Неяк на прадвесьні ў хату пастукалі, я згадаў, што не адчыню. З вуліцы адказалі, што адчыняць сілай дзьверы й тады мне не здабравадь. Жонка й цесьць пачалі прасіць, каб я не ўпарціўся й адчыніў. А то падпаляць хату, згарым разам з душамі, даводзілі хатнія.

У расчыненыя дзьверы ўваліліся шасьцёра чалавек з вінтоўкамі, на шапках у іх наўскос красаваліся чырвоныя стужкі. Начныя госьці не цэрымоніліся й адразу ж запатрабавалі выпіўку й вячэру.

Жонка пачала завіхацца на кухні, а я палез у падпольле, каб прынесьці штоф самагону.

Пад ´еўшы, чырвонастужачнікі распачалі вобыск. Не знайшоўшы ў хаце чаго-кольвечы цікавага й каштоўнага, яны пачалі пагражаць. Я казаў, што я чалавек бедны і ў мяне няма нічога. Тады больш нахабны з партызанаў выцяў мяне шомпалам і згадаў, што ён ведае, што ў мяне ёсьць скураная сьвітка й я павінен абавязкова яе аддаць яму. Я адмаўляўся, казаў, што прадаў скуранку на торжышчы за газу. Удары сыпаліся адзін за другім, дасталося й жонцы. І я вымушаны быў здацца.

У схове, дзе была скураная сьвітка, ляжала яшчэ жончына «ясёнка», кашмыровыя хусткі, храмовыя боты й два сувоі палатна. Увесь гэты скарб партызаны забралі, ды й яшчэ паглуміліся з маёй сям ´і.

— Ці скардзіліся вы немцам!

— Якія скаргі. Паскардзішся, дык ноччу прыйдуць і заб ´юць цябе самога й тваю сям ´ю. Такія выпадкі былі.

Да таго ж немцы й самі зьбіралі падаткі ў выглядзе тых самых кажухоў, суконных рэчаў. У дзень — немцы, ноччу — партызаны, а потым яшчэ нейкія зьявіліся бульбашы. І ўсіх павінен быў абуць, апрануць і накарміць мірны селянін. Як бачыце, у час вайны з нас бралі патроены падатак. І хоць часу прайшло шмат, але й да гэтага дня мне вярэдзіць душу вось што: адкуль маглі ведаць рабаўнікі аб рэчах, якія мае той ці іншы гаспадар. Відаць, сярод вяскоўцаў былі ў партызанаў свае людзі.

P. S.: Друкуючы ўспаміны спадара пятра Дварановіча, мы не зьбіраліся абразіць тых, хто сумленна ваяваў. Проста хочацца, каб людзі ведалі ўсе бакі няпростай і заблытанай гісторыі партызанскага руху на Беларусі.

Размаўляў Г. АСТРОЎСКІ.

5 сьнежня 1947 года мы, вучні сёмага класа Чарніхоўскай сярэдняй школы: я і мой сябар Шурык Клімашэўскі, цяпер Алесь Іосіфавіч, выкладчык кафэдры фізвыхаваньня Брэсцкага пэдінстытута, у гонар дня сталінскай канстытуцыі парэзалі партрэты вялікіх правадыроў: я — Сталіна, ён — Леніна.

Мікола ГРЫШАН.

ПОМСТА


Ня думаў, за гэта што будзе,
Кудысьці падзеўся мой страх,
Як брытваю рэзаў я грудзі,
Акутыя ўсе ў мэдалях.
Ішоў я на помсту сьвядома
За ўсіх: ад старых да малых—
За родных, чужых, незнаёмых—
Закутых ім у кайданы.
Хоць вокал былі гімн — маленькі
Я чуў стогн і звоны акоў:
У муках быў розум, сумленьне—
Тыран піў нявінную кроў.
Тады я адчуў: вецер волі
Шугнуў з Варкуты ў Калыму—
Тыран зьведаў мукі і болі,
Бясьсільле і гібель адчуў.

ВЕРНАСЬЦЬ

Ёсьць на сьвеце краіна такая,
Дзе лугі, нівы, рэкі і гай,
А зямля, як малітва сьвятая,
Хоць да раны яе прыкладай.
Яе дзеці, народжаны ў горы,
Праглі зваццa спрадвеку людзьмі,
Ды пад сонцам, нябесным прасторам
Сабе долі здабыць не маглі.
Як мне люба, як сэрца кранае
Усё, што ёсьць у мілым краі:
Сонца, ранкам што ўсходзіць
над гаем,
Колас жытны на роднай зямлі.
І зямлю, дарагую, сьвятую,
Шчыра, верна люблю ўсёй душой,
З мілай ласкай яе я цалую
Так, як рукі матулі сваёй.

МАРА

Чарнобыль, сьмерці гэрб!
Чарнобыль!
Цябе, праклятага навек,
Рахункам бацькаўскім асобым
Плануе зьнішчыць чалавек.
Адным пуцёўкі на круізы,
Хто ўладай верхняю сагрэт,
А ўсім астатнім даеш візы
Прамым кірункам на той сьвет.
Пасьля цябе мы ўсё пакінем:
Наш боль і радасьць, гора, сьмех,
І промень сонца ў небе сінім,
І ластавак, з-пад родных стрэх.
А хто палічыць нашы страты
І колькі іх яшчэ нам мець?
І з цёмных вокнаў пустых латаў
Глядзець вякамі будзе сьмерць.
Тлусьцеюць з роскашы магнаты,
Ім ні па чым прагрэс, застой,
А ў бабкі беднае Агаты
Няма капейкі за душой.
Усё абскублі. Эх, зладзеі!
Ці прыйдзе час да нас калі,
Што нашы спраўдзяцца надзеі
І зьнікне поскудзь на зямлі?



На вадохрышча

Стала добрай традыцыяй гарадзенскіх праваслаўных вернікаў штогод у дзень, калі Сын Божы Ісус Хрыстос прыняў ад «Ян Хрысьціцеля» хрышчэньне ў рацэ Іярдан, прыходзіць на бераг Нёмана, каб выканаць сьвяты абрад.

Г. АСТРОЎСКІ.

На здымку: сьвятая працэсія падыходзіць да Нёмана. Абрад высьвечваньня вады праводзіць айцец Уладзімір.

Фатаграфаваў У. УЛАДАСЕВІЧ.

Ад тых векапомных часоў беларусы раз-пораз папаўняюць польскі й расейскі этнасы

Кажуць, што для захаваньня нацыі мала адной мовы, культуры й гістарычных традыцый. Патрэбна яшчэ й свая — дзяржаўная вера ў Бога.

Напрацягу стагоддзяў Вуніяцкая царква на Беларусі выконвала гэтую пачэсную місію — ратавала беларусаў, іх душы ад бязпамяцтва.

Сёньня, калі адроджаная высілкамі сумленных беларусаў Вунія наноў пачала выконваць сваю галоўную місію, на саму зьяву вуніяцкай царквы з боку гэрархаў праваслаўнай і каталіцкай дыяспары пасыпалася шмат папрокаў. Пра дзейнасьць вуніяцкай суполкі ў Горадні кар. «Пагоні» распавёў актывіст суполкі Вуніятаў спадар Мікола Воран.

«Для таго, каб мацавалася любая дзяржава, неабходна і свая дзяржаўная вера ва Усявышняга. Гэта падказвае ход гісторыі. Асабліва надзённа пытаньне стаіць перад маладымі дзяржавамі. Мы ствараем незалежную Беларусь, і для маладой дзяржавы, як паветра, патрабуецца свая царква. Я сам праваслаўны, але калі паўстала такое пытаньне, то патрыятызм, які захаваўся ў маёй душы, не дазволіў застацца ў баку. Давялося парваць з праваслаўнай верай і прыслучыцца сябе іншай форме веры ў Бога, я маю на ўвазе Вунію.

Для чаго я гэта зрабіў? Мне не дазваляе сумленьне глядзець, як топчацца маё роднае, бацькоўскае.

Памятаю, калі раней прыходзіў да царквы й прасіў сьвятара зрабіць споведзь на беларускай мове, то ў адказ чуў, што я прыйшоў у храм Расейскай праваслаўнай царквы. Адчуваць сябе чужынцам у сваёй хаце вельмі брыдка. Тым болей, што мае сябры-каталікі таксама скардзіліся на неадпаведнае стаўленьне да беларускай мовы каталіцкіх сьвятароў. Тут я ўсё ж вымушаны зрабіць удакладненьне. Касьцёл хоць і не прапагандаваў беларускай мовы, але й не патураў ваяўніча настроеным вернікам. Зусім іншае мы адчувалі з боку праваслаўнай суполкі.

Калі мы заявілі аб сваім намеры змагацца па закону за Базыльянскі кляштар, то праваслаўныя бабулькі ледзь было не пабіліся з намі падчас супрацьзаконнай перадачы нашай гістарычнай спадчыны на рахунак праваслаўнай царквы.

— Ці можна лічыць Вашу барацьбу за Базыльянскі кляштар скончанай!

— Ні ў якім разе. Але дзейнічаць мы будзем па закону. Нядаўна старшыня нашай вуніяцкай суполкі падаў ліст у гарвыканкам з просьбай аб ´ектыўна разабрацца ў гісторыі. Калі й гэта не дапаможа, будзем зьвяртацца ў суд, апэляваць да міжнароднай супольнасьці.

— Колькі зараз прыхільнікаў Вуніі ў Горадні!

— Актыўна ўдзельнічаюць у руху адраджэньня Вуніі чалавек 50—70. На набажэнствы, якія, дарэчы, праходзяць у Гарадзенскім Доме культуры, прыходзіць таксама ня шмат людзей. Але я ўпэўнены, што з цягам часу нас будзе значна болей. У іншым выпадку, калі мы ня здолеем стварыць сваю дзяржаўную царкву й надалей будзем залежна ад палітычнай сытуацыі раз-пораз папаўняць ці польскі, ці расейскі этнасы.



Мячэць на беразе Нёмана

Як стала вядома рэдакцыі «Пагоні» ад актывіста мусульманскай дыяспары Горадні Ю. Крыніцкага, суполка вернікаў-мусульман вырашыла адмовіцца будаваць свой храм бліз мястэчка Ласосна з мэтай не стварыць на Гарадзеншчыне этнічна-канфэсійных непаразуменьняў.

З гэтай нагоды прыхільнікі Ісламу зьвярнуліся да ўладаў Горадні паспрыяць у выдзяленьні надзелу зямлі пад будаўніцтва мячэці ў іншым месцы горада. Гарвыканкам пазытыўна паставіўся да просьбы гарадзенскіх мусульманаў і выдзяліў кавалак зямлі бліз вёскі Солы, што непадалёк шпіталя ВА «Азот».

Г. У.

Гасьцям заўжды рады

Пасьля літургіі, якую правёў мэтрапаліт Менскі й Слуцкі Філарэт падчас сьвята Увядзеньня ў храм Прасьвятой Багародзіцы, міністр замежных спраў Беларусі П. Краўчанка перадаў вернікам Міхайлаўскай царквы дзьве тысячы даляраў на аздабленьне славутага берасьцейскага храма—вядомага помніка дойлідзтва.

Гэтыя грошы ў час знаходжаньня міністра ў Кліўленьдзе ахвяраваў для Міхайлаўскай царквы беларус па паходжаньню Анатоль Лук ´янчык. Ён мае завод па вырабу кандыцыянэраў для кватэр, яго не пакідае вялікае жаданьне хоць раз паглядзець на гэты сусьветна вядомы помнік архітэктуры XV — XVI стагоддзя.

Пётр ЖЭБРАК.



ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ

В. ПАНУЦЭВІЧ

Горадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918—1919 гадох

1. Горадня — сталіца вызвольнага беларускага руху

Так як у мінуўшчыне, Горадня адыгравала сваю ролю і ў пэрыяд самастанаўленьня народаў ды ўзнаўленьня нашай дзяржаўнасьці — Беларускай Народнай Рэспублікі. Найменна ў 1918—1919 гг. Горадня сталася сядзібай ураду БНР і Беларускага Міністра пры жамойцкай дзяржаве, і месцам тварэньня сваіх збройных сілаў пасьля таго, як скапітулявала Нямеччына і бальшавікі занялі бальшыню беларускай тэрыторыі зь Менскам і Вільняй.

Горадня перад Першай Сусьветнай Вайной была сталіцай Горадзенскай губэрні, якая займала 34.060 квадр. вёрст з наступнымі паветамі: Горадзенскі, Берасьцейскі, Беластоцкі, Бельскі, Ваўкавыскі, Кобрынскі, Пружанскі, Слонімскі і Сакольскі.

Перад вайной, пачынаючы ад 1913 году, царскі ўрад пабудаваў вакол Горадні 12 фортаў і ваенных умацаваньняў, творачы з Горадні цьвярдыню.

Немцы, заняўшы Горадню ў верасьні 1915 году, горадзенскія ўмацаваньні аднавілі ды разбудавалі, аднак ня ў Горадні, але ў Беластоку ўтварылі «Мілітэрфэрвальтуг Бялісток-Гродно». Як у Горадні, так і яго ваколіцах стаяла многа нямецкага войска.

Немцы ад самага пачатку сваёй акупацыі Горадзеншчыны і іншых земляў Беларусі няпрыхільна паставіліся да справы аднаўленьня беларускай дзяржаўнасьці. Заняўшы беларускія землі, яны Сувальшчыну й Ломжу далучылі да Усходняе Прусіі, а на рэшце земляў устанавілі акупацыйную ўдалу «Обэр-Ост», якая абыймала тры правінцыі: «Мілітэрфэрвальтунг Літаўэн», «Мілітэрфэрвальтунг Курлянд» і «Мілітэрфэрвальтунг Бялісток-Гродно». Да акругі «Літаўэн» (Літвы у знач. Жамойці) яны далучылі Вільню, Віленскі, Троцкі і Сьвянцянскі паветы.

У акругу «Курляндыя» немцы ўлучылі Дзьвінск і беларускую Латгалію. З гэтых дзьвюх акругаў яны меркавалі зрабіць нямецкія правінцыі ды засяліць шчыльна Немцамі. Акруга «Беласток-Горадня» мела быць у рэзэрве, як аб ´ект гандлю ў перамовах з Ресеяй аб сэпаратным міры. На ўсякі выпадак Немцы дапушчалі толькі беларускае школьніцтва, культурныя беларускія арганізацыі ды беларускую газэту «Гоман», што выдавалася ў Вільні.

На тэрыторыі Горадзеншчыны пры Немцах было 177 беларускіх школаў.

Нямецкія пляны крыху зьмяніліся з далучэньнем ЗША да Антанты ў 1917 г., асабліва пасьля апублікаваньня ведамых 14 пунктаў Вільсана аб самавызначэньні народаў (8.1.1918). Тады Немцы выракліся анэксіі «Літвы» і «Курляндыі», а сталі падрыхтоўваць нібы ў духу «самавызначэньня» народаў акругі «Літву», «Курляндыю» і «Украіну» як сваіх сатэлітаў.

Ажыцьцяўленьнем гэтай нямецкай палітыкі адносна Жамойці («Літаўэн») быў імі арганізаваны 18 верасьня 1917 г. зьезд прадстаўнікоў ад аранізацыяў і адміністрацыйных управаў у Вільні дзеля ўстанаўленьня жамойцкай нацыянальнай рэпрэзэнтацыі. На зьездзе была выбраная «Краёвая Рада», па-жамойцку —«вальстыбэс Тарыба», або проста Тарыба, якая мела прадстаўляць перад Немцамі інтарэсы Жамойці.

11 сьнежня 1917 г. Тарыба падпісала дэклярацыю аб утварэньні «Летувіскай» дзяржавы ў цеснай лучнасьці зь Нямеччынай пры супольнай ваеннай, эканамічнай і мытнай сыстэмах. Межы гэтай «дзяржавы» спачатку абыймалі межы акругі «Літаўэн», г. зн. уключалі апрача Жамойці беларускую тэрыторыю: Вільню, Трокі, Сьвянцяны й Сувалкі.

Мірныя перамовы ў Берасьці з бальшавікамі, а ў асаблівасьці супраціў Троцкага на адрыў Прыбалтыкі ад Расеі ды ўмыснае зацягваньне перамоваў савецкай дэлегацыяй, заважылі на далейшых тэрытарыяльных пераменах коштам беларускіх земляў. Немцы не дапусьцілі дэлегацыі БНР з д-р Цьвікевічам на чале да ўдзелу ў нарадах у Берасьці, разглядаючы беларускую тэрыторыю за аб ´ект гандлю з бальшавікамі й новымі контрагентамі — Украінцамі і Жамойцамі.

Такім чынам, 8 лютага 1918 г. быў падпісаны ў Берасьці сэпаратны мір з Украінай ды прызнаньне за ёй беларускага Палесься. Адначасова Немцы нанова далучылі да Прусіі Сувалкі і Аўгустова, а ўзамен за гэта да жамойцкай дзяржавы далучылі беларускія землі: ўсю Горадзенскую губэрню, усю Віленскую губ. і заходнія часткі Менскай. Такім парадкам Заходняя Беларусь на захад ад лініі: Дзьвінск — Навагрудак — Пінск — Берасьце, лучыла ў жамойцкую дзяржаву.

Супраць гэтага нямецкага падзелу тэрыторыі Беларусі, замацаванага яшчэ сэпаратным мірам з Расеяй 3 сакавіка 1918 г. ды прызнаньнем незалежнасьці жамойцкай дзяржавы зь берасьцейскімі граніцамі кайзэрам Вільгельмам (23 сакавіка 1918), Рада БНР выдала сваю пратэстацыйную грамату 9 сакавіка ды абвесьціла незалежнасьць БНР 25 сакавіка 1918 г.

У чытача можа ўзьнікнуць пытаньне, чаму Беларусы не тварылі свайго войска ды сілай не баранілі свае краіны перад захопнікамі?

Трэба перш за ўсё памятаць, што Беларусь у часе Першай Вайны была разьдзелена лініяй нямецка-расейскага фронту. Тут канцэнтраваліся мільённыя арміі варожых дзяржаваў, уведзены быў ваенны стан і ўсякія нацыянальныя рухі былі вайсковай уладай акупантаў забароненыя. Незалежна ад гэтага, насельніцтва было змабілізаванае ў расейскую армію, эвакуаванае, расьцярушанае прыфрантовымі работамі, а гаспадарчае жыцьцё зьнішчанае. Не знайшлося ніводнай дзяржавы, якая была зацікаўлена аднаўленьнем беларускай дзяржаўнасьці. Інакш кажучы, Беларусь паўставала да свайго незалежнага жыцьця выключна сваімі собскімі ды моцна падарванымі сіламі ўва ўмовах бадай што найцяжэйшых у параўнаньні зь іншымі народамі. Нашыя суседзі: Жамойцы, Латышы, Эстонцы, Украінцы й Палякі мелі сваіх моцных пратэктараў звонку, і дзякуючы гэтай пратэкцыі ім было куды лягчэй бараніцца.

(Працяг будзе).

75 гадоў таму

1 студзеня споўнілася 75 гадоў з дня заснаваньня Віленскай беларускай гімназіі, вучэльні, якая адыграла адметную ролю у станаўленьні й выхаваньні нацыянальна-сьвядомай беларускай інтэлігенцыі, беларускай школы, навукі, шэрагу выдатных палітычных дзеячоў і змагароў за незалежнасьць Беларусі. Час заснаваньня Віленскай гімназіі — гэта час лёсаноснай барацьбы тытанаў беларускага Адраджэньня за вольнасьць беларускага народа, эпіцэнтр якой 75 гадоў назад перамясьціўся ў Горадню, дзе працавала рада БНР. Аб падзеях даўно мінуўшых гадоў апавядае аўтар беларускага замежжа Вацлаў Пануцэвіч у сваім артыкуле «Гарадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918—1919 гадах», які быў надрукаваны ў газэце «Бацькаўшчына» (№ 3—10, жнівень 1964, Мюнхэн).

Некалькі слоў пра аўтара. Эмігрант ваенных часоў — перамешчаная асоба, Вацлаў Пануцэвіч здолеў пераехаць на сталую працу, уключыўся ў беларускае нацыянальнае жыцьцё Чыкага. Менавіта тут, ці не ў адзіным месцы Паўночнай Амэрыкі, аб ´ядналіся розныя хвалі эмігрантаў, утварыўшы Беларуска-амэрыканскую нацыянальную раду. В. Пануцэвіч стаў сакратаром рады. Адначасова ён быў актыўным дзеячом Беларуска-амэрыканскага каталіцкага таварыства, нават яго віце-старшынёй, якое ўзначальваў Станіслаў Грынкевіч. У пачатку 60-х гадоў Вацлаў Пануцэвіч выступіў як заснавальнік і кіраўнік выдавецкай Сябрыны ў Чыкага, якая выдавала часопіс «Беларуская царква», шэраг іншых беларускамоўных выданьняў. Як бачна з прапаноўваемага увазе чытачоў гэтага артыкула, В. Пануцэвіч цікавіўся і валодаў гістарычным матэрылам. Яго пяру належыць такі буйны твор, як манаграфія «Жамойдзь і Літва», выдадзеныя ў Чыкага ў 1953 г. У часы эміграцыі В. Пануцэвіч, нягледзячы на складанае палітычнае становішча беларускай эміграцыі, застаўся верным «ідэі БНР» і нават у канцы 60-х гадоў прыняў захады аб арганізацыі Лігі БНР у Чыкага. Пазьней ён працаваў у Чыкагскім сэктары БНР.

Узгаданыя гістарычныя творы Вацлава Пануцэвіча, як і многіх іншых прадстаўнікоў беларускай дыяспары, застаюцца маладаступнымі сёньняшняму чытачу. Але, на шчасьце, сярод замежных беларусаў ёсьць людзі, якія захавалі праз шмат гадоў выданьні, якія ў свой час гуртавалі й падтрымлівалі іх у цяжкія й жорсткія гады на чужбіне. Адзін з такіх людзей — Міхась Махнач, які жыве ў штаце Ілінойс. Ніколі не адмаўляўся ад беларускай справы, актыўна супрацоўнічаў як карэспандэнт з замежным беларускім друкам. У мінулым годзе ён быў дэлегатам І зьезду беларусаў сьвету. Менавіта яму мы ўдзячны за ўнікальны дар — выданьні беларускага замежжа пасьляваенных гадоў. Шэраг матэрыялаў з гэтых выданьняў будзе абавязкова передрукаваны «Пагоняй». А пачаць гэту справу, відаць, мэтазгодна з матэрыяла В. Пануцэвіча, што тычыцца Горадні. Такой, якой яна была 75 гадоў назад.

А. МАЙСЯЁНАК,
старшыня Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі, член праўленьня фонда «Бацькаўшчына».

Мастакі любяць Горадню

20 студзеня ў Горадні ў Новым замку адкрылася першая ў гэтым годзе выстава. Яе аўтары — маладыя беларускія мастакі з Менску — Сяргей Сялецкі й Ганна Каралёва, абодва выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Выстава называецца «Палёт Навігатара».

Як заўважыў нехта з выступаўшых падчас адкрыцця,— яны прывезьлі ў Горадню цалкам новае мастацтва, у якім шмат ідзе ад слова, у іх карцінах вызначаецца інтэлектуальнасьць і начытанасьць.

Сяргей і Ганна ўпершыню ў жыцьці наведалі Горадню й вельмі ўдзячны лёсу, што іх першая сумесная выстаўка адкрылася менавіта ў нашым горадзе, дзе, як ім здаецца, жыве нешта вечнае. Увогуле, як сказаў С. Сялецкі: «Хацелася пачынаць свой шлях у мастацтве прыгожа й таму мы выбралі Горадню». Дарэчы, у Сяргея ўжо былі выставы ў Польшчы, ЗША, а пасьля Горадні ён зьбіраецца ў Нямеччыну. Для Ганны гэта першая па-сапраўднаму значная выстава, паколькі дагэтуль яна рабіла спробы толькі ў калектыўных. Напэўна таму адчувалася яе хваляваньне.

На жаль, у той дзень у Новым замку было ня вельмі шматлюдна, аднак вельмі раю, шаноўныя гарадзенцы й госьці нашага горада, наведаць выставу «Палёт Навігатара», на ёй прадстаўлена новае беларускае мастацтва.

М. К.

Фатаграфаваў А. УЛАДАСЕВІЧ.





31, ПОНЕДЕЛЬНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

9.25, 21.35. Пад купалам сусвету. 9.35, 21.55. Пяць хвілін на жарты. 9.40. Угледзецца ў твар. 10.20. «Усе мы родам з дзяцінства». І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль. Частка 1-я. 11.35. Да 50-годдзя вызвалення Беларусі. 12.15. «Клічаўскі пачастунак». Музычная праграма. 13.30. Навіны (з сурдаперакладам). 13.40. Кароткаметражныя фільмы. 14.40. Каралеўскае паляванне. 15.40. Тэлебачанне — школе. Музыка. 16.10. Дзіцячы парламент. 17.30. Дзённік Прынёмання. (Гр.). 17.45. «Над Нёманам». Праграма на польскай мове. (Гр.). 18.40. Веснік гарсавета. (Гр.). 19.15. Тэледыялог. (Гр.). 20.25. Дарунак «Тэлесябрыны». 20.35. Калыханка. 21.00. Панарама. 21.45. Надвор 'е. 22.00. Спартыўны тэлекур 'ер. 22.20. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 22.25. НІКа. 22.40. Беларускі Гамлет.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

17.00, 20.00, 00.00. Новости. 17.25. Гол. 17.55. Документы и судьбы. 18.10. Премьера худ. телесериала «Мелочи жизни». 33-я серия. 18.40. Миниатюра. 18.55. Эксклюзив. «Светлана — дочь Иосифа...». Часть 2-я. 19.40. Спокойной ночи, малыши! 20.45. Любовь в галантном веке. 21.45. Театр+ТВ: Константин Райкин крупным планом. 22.35. Пресс-клуб представляет канал иллюзий. 23.45. Футбол. Международный турнир. Кубок чемпионов содружества. 00.20. Пресс-экспресс.

КАНАЛ «РОССИЯ»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Вести. 6.20. Требуются... Требуются... 6.30. Формула-730. 7.00. Ваше право. 7.20. Время деловых людей. 7.50. Мульти-пульти. 8.00. Всемирные новости Эй-би-си. 8.30. Совершенно секретно. 9.20. «Военное ретро». Концерт, посвященный освобождению Ленинграда от фашистской блокады. 10.30, 16.15. Новая линия. 11.00. Кинотеатр актера. В. Лановой Худ. фильм «Павел Корчагин». 12.40. Крестьянский вопрос. 13.25. «Моя морячка». Худ. фильм. 14.40. Параллели. 14.55. Телегазета. 15.00. Бизнес в России. 15.30. Там-там-новости. 15.45. Устами младенца. 16.50. Спасение 911. 17.45. Русская виза. 18.15. Абракадабра. 18.45. Праздник каждый день. 19.25. Подробности. 19.40. «Невероятная кража». Худ. фильм. 20.40. В мире авто-и мотоспорта. 21.15. Без ретуши. 22.40. Автомиг. 22.45. Звезды говорят. 22.50. Спортивная карусель. 22.55. Музыка крупным планом.

ПОЛЬША-І

13.15. Документальный фильм. 13.45. Программа для молодежи. 14.30. Школы в Европе. 14.50. Документальный фильм. 15.45. Поляк и власть. 16.05. Подпольная власть. 16.25. Лицо власти. 16.45. Лексикон демократии. 16.55. Программа на вечер. 17.05. Программа для подростков. 17.50. Музыкальная программа. 18.00. Телеэкспресс. 18.20. Квант. 18.40. Право и бесправие. 19.05. Комедийный сериал пр-ва США. 19.30. Документальный фильм. 20.00. Вечеринка. 20.30. Главный выпуск новостей. 21.00. Прямо из Бельведера. 21.20. Телетеатр. 23.15. Миниатюры. 23.20. Репортаж. 23.35. Гость музыкальной программы. 00.00. Новости. 00.15. Горячая линия. 00.25. Музыкальная программа. 00.40. «Жизнь на продажу». Сериал пр-ва Италии. 02.20. Развлекательная программа.

ПОЛЬША-ІІ

12.00. Панорама. 12.05. Студия второй программы. 12.10. 7 дней польского спорта. 13.00. Документальный фильм. 14.00. Панорама. 14.05. «Сорокалетний — двадцать лет спустя». 15.00. «Пан Клекс в космосе». Фильм пр-ва Польши. 16.45. Приветствие. 17.00. Панорама. 17.05. Спортивная студия. 17.15. Польские композиторы. 17.40. Обзор кинохроник. 18.15. Польская кинохроника. 18.30. «Любовь и дипломатия». Сериал пр-ва Канады. 19.00. Панорама. 19.05. Местная программа. 19.35. Колесо фортуны. 20.05. Документальный фильм. 21.00. «Молнии». Сериал пр-ва США. 21.20. Автожурнал. 22.00. Панорама. 22.30. Спорт. 22.40. Репортеры двойки представляют. 23.00. «Перри Мэйсон». Фильм пр-ва США. 00.25. Марафон трезвости. 01.05. Панорама. 01.10. Ночь и стресс. 01.25. Музыка и здоровье. 01.45. «Молнии». Сериал пр-ва США. 02.05. Финал американского футбола.

1, ВТОРНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. 8.10, 21.35. Пад купалам сусвету. 8.20, 21.50. Надвор 'е. 8.30, 21.45. Пяць хвілін на жарты. 8.35. «Ане Вескі». Фільм-канцэрт. 9.00. Тэлебачанне — школе. Музыка. 9.30. Тэлеклуб «Гаў-гаў». 9.50. «Пастушыныя гульні». Інсцэніроўка. 10.30. «Усе мы родам з дзяцінства». І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль. Частка 2-я. 11.55. Студыя «Тэлесябрына». 12.55. Палесся мілае дзіця... 13.30. Навіны (з сурдаперакладам). 13.40, 18.00. Дзелавая хроніка. 13.50. «Дзіна». Маст. фільм. 15.20. Тэлебіржа. 15.30. «Нов і К»-топ-10.16. 30. Беларуская літаратура. 16.55. Гаспадар. Адзіная рублевая зона: плюсы і мінусы. 17.40. Для школьнікаў. Скарбы беларускай гісторыі. 18.10. Дзённік Прынёмання. (Гр.). 18.20. «Прыслухайцеся». Да вас звяртаюцца былыя асуджаныя. (Гр.). 18.40. Тэледыялог. (Гр.). 19.00. Крымінальная хроніка. 19.15. Навошта дадзена ўлада? 20.05. «Мост». Культурна-асветніцкая праграма. 20.35. Калыханка. 21.00. Панарама. 22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — «Ніхто, акрамя цябе». Тэлесерыял; Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя, Беларускі Гамлет. Памяці акцёра Юрыя Казючыца.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 17.00, 20.00, 00.00. Новости. 5.20. Утренняя разминка. 5.30. Утро. 7.45. Мультфильм. 8.20. Веселые нотки. 8.40. Премьера телефильма «Просто Мария». 9.30. Человек и закон. 10.00. Маленький концерт. 10.10. Наш музыкальный клуб. 10.50, 24.20. Пресс-экспресс. 11.00, 14.00. Новости (с сурдопереводом). 11.20. «Соломенная шляпка». Худ телефильм. 1-я и 2-я серии. 13.30. Во дворце на Садовом кольце. 14.25. Деловой вестник. 14.40. Хроника деловой жизни. 15.10. Дело. 15.20. «Моя семья и другие животные». Телефильм. 7-я серия. 15.55. Возвращение к зрителю. 16.10. Наш музыкальный клуб. 16.50. Азбука собственника. 17.25. За кулисами. 17.50. Документы и судьбы. 18.05. «Просто Мария». 18.55. Тема. 19.40. Спокойной ночи, малыши! 20.45. Лидер. 21.30. Из первых рук. 21.45. Бал олимпийцев. 23.00. Кино до востребования. 23.30. Жизнеописание. 00.30. Авторалли «Русская зима».

КАНАЛ «РОССИЯ»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Вести. 6.20. Требуются... Требуются... 6.30. Формула-730.7.00. Досуг. 7.20. Время деловых людей. 7.50. Мульти-пульти. 8.00. Всемирные новости Эй-би-си. 8.30. Клуб «Желтая подводная лодка». 11.00. «Мой друг Иван Лапшин. Худ. фильм. 12.40. Крестьянский вопрос. 13.25. «Урок жизни». Худ. фильм. 15.15. Концерт. 15.30. Там-там новости. 15.45. Студия «Рост». 16.15. Новая линия. 17.00. Романсы П. И. Чайковского. 17.30. Рубежи . 17.45. Проще простого. 18.45. Праздник каждый день. 19.25. Подробности. 19.40. Премьера худ. телефильма «Санта-Барбара». 274-я серия. 20.30. Арт-обстрел. 21.15. Тихий дом. 22.40. Автомиг. 22.45. Звезды говорят. 22.50. Спортивная карусель. 22.55. Зов Водолея.

ПОЛЬША-І

14.35. Наша Балтика. 14.50. Кухня. 15.05. Клуб домашнего компьютера. 15.20. Австралия. Кенгуру. 15.45. Теория чисел. 16.00. Рисуй с нами. 16.15. Со знанием по жизни. 16.30. Джойстик. 17.05. Программа для молодежи. 17.50. Музыкальная программа. 18.00. Телеэкспресс. 18.20. Сенсации XX века. 18.40. Сто лет кино. Ч. Чаплин. 19.05. «Марфи Браун». Сериал пр-ва США. 19.30. Чрезвычайный пересмотр. 20.00. Вечеринка. 20.30. Главный выпуск новостей. 21.00. Сеймограф. 21.25. «Прикосновение руки». Фильм пр-ва Польши. 23.05. Письма о хозяйстве. 23.35. Мир У. Сипинской. 00.00. Вечерние новости. 00.15. Горячая линия. 00.25.Музыкальная программа. 00.30. Необычные биографии. 01.20. После полуночи. 02.05.Программа французского телевидения.

ПОЛЬША-ІІ

14.00. Панорама. 14.05. «Над рекой». Сериал пр-ва Австралии. 15.00. «Пан Клекс в космосе». Фильм пр-ва Польши. 16.05. Развлекательная программа. 16.25. Марафон трезвости. 16.55. Приветствие. 17.00. Панорама. 17.05. Спортивная студия. 17.15. Дом. 17.35. Репортаж. 17.45. Отчизна. 18.00. Тележурнал. 18.10. Католическая программа. 18.35. «Любовь и дипломатия». Сериал пр-ва Канады. 19.00. Панорама. 19.05. Местная программа. 19.35. Колесо фортуны. Телетурнир. 20.05. Документальный фильм. 21.00. Театральная студия. 22.00. Панорама. 22.30. Спорт. 22.40. Экологическая программа. 23.00. «Поцелуй смерти». Фильм пр-ва США. 01.00. Панорама. 01.05. «Враг врага». Сериал пр-ва Швеции.

2, СРЕДА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. 8.10, 21.35. Пад купалам сусвету. 8.20, 21.50. Надвор 'е. 8.30, 21.45. Пяць хвілін на жарты. 8.35. «Дывертысмент». Фільм-канцэрт. 9.00. Беларуская літаратура. 9.25. «Ніхто, акрамя цябе». Телесерыял. 10.10. «Маэстра клоун і мы». Фільм-канцэрт. 10.40. Аэробіка. 11.15. Песню бярыце з сабою. «Залатая ліра». 13.30. Навіны (з сурдаперакладам). 13.40. «Цар Іван Грозны». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі. 15.50. Мультфільмы. 16.20. «Вайгач». Кінанарыс. 16.40. Відзьма-нявідзьма. 17.40. Закон і мы. Урадавыя дакументы аб уласнасці на зямлю. 18.10. Абласны я навіны. (Гомель). 18.25. Навіны Бі-бі-сі. 19.00. Дзённік Прынёмання. (Гр.). 19.10. «Гарадніца». Літаратурна-мастацкая праграма. (Гр.). 20.05. Дзелавая размова. 20.30. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35. Калыханка. 21.00. Панарама. 22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — «Ніхто, акрамя цябе». Тэлесерыял, Чэмпіянат Беларусі па валейболу. Жанчыны «Энка» (Мінск) — «Нёман» (Гродна), Асацыяцыя кінатэлебачання прадстаўляе: кінарэжысер Л. Голуб.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

